**Чэрвень 2024**

**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у X клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў кадэцкіх**
**вучылішчах па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

## Святыя крыніцы

Святыя крыніцы. Яны нашы лекары і суцяшальнікі. Напіўся са святой крыніцы — і ты ўжо здаровы.

Беларусы заўсёды паважалі ўсе свае крыніцы, а святыя асабліва. Ведаючы, што іх вада мае надзвычайную сілу, людзі прасілі ў крыніц выратавання і здароўя.

Паблізу крыніц беларусы ўзводзілі храмы. Каля такой крыніцы пабудавана Полацкая Сафійка. Гэта велічны манументальны помнік, сусветна вядомы шэдэўр нашага дойлідства.

Да крыніц мы хадзілі і ў святы, і ў будні. Іх жывая вада змывала нашы хваробы, нечаканы смутак. Калісьці да жывой вады людзі спяшаліся прыйсці да ўсходу сонца, пакуль над ёй не праляцела птушачка. Нечапаная вада, верылі мы, валодае самай гаючай сілай.

У беларусаў здаўна быў культ вады. Вада — адна з чатырох асноўных стыхій, што ўтвараюць сусвет. Паветра судакранаецца з ёй, агонь баіцца яе, а зямля ўвогуле абапіраецца на ваду. Таму ўсе мы павінны шанаваць яе. (136 слоў)

*Паводле Я. Сіпакова*